Спорт-тайм

# БЕЛАРУСЫ — САМЫЯ МОЦНЫЯ

## У традыцыйным аглядзе «Звязды» расказваем пазітыўныя спартыўныя навіны

**ГЕРОІ ТЫДНЯ.** Беларускія спартсмены заваявалі сем узнагарод на чэмпіянаце Еўропы па барацьбе, які прайшоў у Румыніі. Ванеса Каладзінская (да 53 кг) і Ірына Курачкіна (да 57 кг) сталі чэмпіёнкамі Еўропы. Алеся Гетманава (да 59 кг) і Вераніка Іванова (да 62 кг) — бронзавымі прызёрамі чэмпіянату. У спаборніцтвах па барацьбе грэка-рымскага стылю Кірыл Маскевіч (да 87 кг) і Абубакар Хаслаханаў (да 97 кг) заваявалі бронзавыя медалі. У барцоў вольнага стылю на другую прыступку п'едэстала падняўся Магамедхабіб Кадзімагамедаў (да 79 кг).



**ТУРНІР ТЫДНЯ.** У сталіцы Балгарыі Сафіі прайшоў чэмпіянат Еўропы па цяжкай атлетыцы, на якім у нейтральным статусе выступаюць беларусы. У катэгорыі да 71 кг Беларусь прадстаўляла Сюзана Валадзько, якая стала сярэбраным прызёрам турніра. У суме штуршка і рыўка яна набрала 235 кг. У катэгорыі да 55 кг яшчэ адна беларуска Юлія Гуліна заваявала «серабро» ў рыўку.

У мужчынскіх спаборніцтвах у катэгорыі да 96 кг Беларусь прадставілі адразу два спартсмены: Павел Хадасевіч і Юльян Курловіч. У суме Павел Хадасевіч набраў 360 кг і стаў бронзавым прызёрам чэмпіянату Еўропы. Юльян Курдовіч размясціўся на чацвёртай пазіцыі. Пётр Асаёнак, які выступае ў катэгорыі да 89 кг, стаў уладальнікам малога бронзавага медаля ў штуршку.

**МЕДАЛЬ ТЫДНЯ.** У сталіцы Катара горадзе Доха працягваецца чэмпіянат свету па водных відах спорту 2024 года, на якім у нейтральным статусе выступаюць беларускія спартсмены. Анастасія Шкурдай заваявала бронзавы медаль на дыстанцыі 200 метраў брасам. Вынік Анастасіі склаў 2:09,08 сек. Бронзавы медаль чэмпіянату свету стаў для Шкурдай найбуйнейшым дасягненнем у кар'еры на міжнародных стартах.

**ЛІЧБА ТЫДНЯ.** 11 медалёў заваявалі беларусы на Усерасійскай спартакіядзе наймацнейшых спартсменаў па зімовых відах спорту 2024 года. Выступалі нашы атлеты ў сямі відах спорту. Адзінай беларускай чэмпіёнкай спартакіяды стала канькабежка Марына Зуева, якая перамагла на дыстанцыі 5000 метраў. Сярэбраныя медалі заваявалі біятланіст Антон Смольскі (індывідуальная гонка), гарнальжніца Марыя Шканава (слалам), фрыстайлістка Ганна Дзяруга (асабісты залік), а таксама зборная Беларусі па лыжнай акрабатыцы ў складзе Ганны Дзяругі, Макара Мітрафанава і Ігара Драбянкова.

Бронзавымі прызёрамі Усерасійскай спартакіяды сталі біятланісты Павел Бялько, Іван Тулацін, Дзмітрый Лазоўскі і Антон Смольскі (мужчынская эстафета), Ганна Сола, Дар'я Кудаева, Дзінара Смольская і Ірына Лешчанка (жаночая эстафета), канькабежцы Ігнат Галавацюк і Ганна Ніфонтава, таксама лыжныя акрабаты Анастасія Андрыянава і Макар Мітрафанаў (індывідуальныя спаборніцтвы).

**НАДЗЕІ ТЫДНЯ.** У РЦАП па зімовых відах спорту «Раўбічы» завяршыўся фінальны этап рэспубліканскіх спаборніцтваў сярод дзяцей і падлеткаў па біятлоне «Снежны снайпер» на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. На спаборніцтвах выступілі юнакі, якія не займаюцца біятлонам у спецыялізаваных навучальна-спартыўных установах. Усяго ў рэспубліканскім фінале прынялі ўдзел 168 юных спартсменаў з каманд абласцей і горада Мінска.

У асабістых гонках у малодшай узроставай катэгорыі (10—11 гадоў) пераможцамі сталі мінчане Аляксей Мормель і Сафія Ластоўская. У сярэдняй узроставай катэгорыі (12—13 гадоў) найлепшыя вынікі паказалі Радзівон Акатаў (Мінская вобласць) і Вікторыя Яўсеенка (Магілёўская вобласць). Чэмпіёны старэйшай узроставай групы (14—15 гадоў) — Яраслаў Петрушэнка (Гомельская вобласць) і Уладзіслава Акоча (Мінск).

У змешанай эстафеце ў малодшай групе перамагла каманда Мінска ў складзе Віялеты Драгнёвай, Аліны Бартошак, Аляксандра Шастака і Пятра Дуброўскага. Перамогу сярод біятланістаў сярэдняй узроставай групы таксама атрымала сталічная чацвёрка, якую сфарміравалі Дзіяна Крывецкая, Ліяна Галавачэнка, Клім Гнедчык і Багдан Бобрык. Першымі ў змешанай эстафеце ў старэйшай групе зноў фінішавалі мінчане — трыумф падзялілі Соф'я Сіманава, Дар'я Муравейка, Мікіта Матус і Мацвей Коржык.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

## 20 ЛЮТАГА Даты Падзеі Людзі

У краіне

**1889** год — нарадзіўся (в. Балотца, цяпер у Навагрудскім раёне) Фёдар Фёдаравіч Турук, беларускі гісторык, грамадскі дзеяч, прафесар. З 1915 года выкладчык у гімназіях Мінска і Масквы. Адзін з арганізатараў Беларускага народнага ўніверсітэта і Беларускага навуковага таварыства ў Маскве. Удзельнічаў у арганізацыі БДУ, з 1921 года прафесар ва ўніверсітэце. Аўтар прац па гісторыі Беларусі. Аўтар прадмовы і складальнік «Курса беларусазнаўства».



**1903** год — нарадзіўся (сяло Хоціна, Лепельскі павет, Віцебская губерня, цяпер Бешанковіцкі раён) Леў Даватар, савецкі военачальнік, генерал-маёр, Герой Савецкага Саюза. Леў Міхайлавіч вядомы паспяховымі аперацыямі па знішчэнні войскаў праціўніка ў пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны. За галаву Даватара нямецкае камандаванне прызначала буйную ўзнагароду.

**1922** год — нарадзіўся (г. Бабруйск) Міхаіл Яўгенавіч Цікоцкі, беларускі мовазнаўца, журналіст, доктар філалагічных навук, прафесар, заслужаны работнік культуры Беларусі. Аўтар даследаванняў па праблемах стылістыкі беларускай мовы і газетных жанраў, тэорыі і практыкі журналістыкі.

**1947** год — нарадзіўся (в. Вялікае Стахава) Валерый Яўгенавіч Мазынскі, рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. З 1974 года — рэжысёр, у 1976—1989 гадах — галоўны рэжысёр Беларускага тэатра імя Я. Коласа, адзін з ініцыятараў стварэння пры тэатры беларускага тэатра «Лялька». Заснавальнік, у 1993—2000 гадах — мастацкі кіраўнік Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі. Паставіў спектаклі «Сымон-музыка», «Парог», «Вечар», «Радавыя» і іншыя. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі і прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

У свеце

**395** год — у Віфлееме быў заснаваны першы жаночы манастыр.

**1809** год — у парыжскім часопісе «Фігаро» быў апублікаваны «Маніфест футурызму», які азнаменаваў нараджэнне авангардысцкай мастацкай плыні 1910-х — пачатку 1920-х гадоў. Найбольш поўна яна праявілася ў Італіі і Расіі.



**1844** год — нарадзіўся Джошуа Слокам (знік без вестак у 1909-м), канадскі марак, які першым здзейсніў адзіночнае кругасветнае плаванне.

**1907** год — нарадзіўся Юрый Аляксандравіч Пабеданосцаў, савецкі канструктар у галіне ракетнай тэхнікі, адзін са стваральнікаў рэактыўных снарадаў для «Кацюшы». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

Так гаварыў...

**ГАБРЫЭЛЬ КАЛЕТ:**

*«Работа падобна на прыгожую жанчыну — яна не любіць чакаць».*

# СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.20 | 18.27 | 10.07 |
| Віцебск — | 8.12 | 18.14 | 10.02 |
| Магілёў — | 8.10 | 18.17 | 10.07 |
| Гомель — | 8.03 | 18.17 | 10.14 |
| Гродна — | 8.34 | 18.43 | 10.09 |
| Брэст — | 8.32 | 18.47 | 10.15 |

### Месяц

*Першая квадра 16 лютага.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

### Імяніны

*Пр. Аляксандра, Лукі, Парфена.*
*К. Анеты, Людмілы, Леха, Лявона, Юльяна.*



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Дзяўчаты такія: «Ой, інвестыцыі — гэта занадта складана, я нічога ў гэтым не разумею». А потым выходзяць замуж за лейтэнанта, каб стаць жонкай генерала.

**Жонка з незадаволенай фізіяноміяй «наязджае» на мужа:**

**— Гэта ўсё з-за той маладзенькай прадаўшчыцы ў міні і з дэкальтэ! Ты не туды тарашчыўся і купіў сабе кароткія штаны!**

**Муж, разглядаючы штаны, сумна:**

**— Так, караткаватыя...**

**Але праз секунду — ужо радасна:**

**— Пайду памяняю!**

— А праўда, што татуіроўка на ўсё жыццё?

— Не, крышку даўжэй.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.985. Індэкс 63850. Зак. № 373.

Нумар падпісаны ў 19.30 19 лютага 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12